# У Белавежу ўвайдзі, нібы у храм...

Вусны часопіс, прысвечаны 600-годдзю Белавежскай Пушчы.

Мэты: стварэнне ўмоў для фарміравання экалагічігага мыслення вучняў; развіццё цікавасці да прыродных аб'ектаў, з'яў; выхаванне грамадзянскасці і патрыятызму, заснаванага на любові да сваёй зямлі, свайго народа, яго культуры і гісторыі.

Абсталяванне: мультымедыяпраектар для паказаў слайдаў, магнітафон, аўдыёзапісы, карта-схема Белавежскай пушчы, наборы паштовак з відамі куткоў прыроды, раслін і жывёл пушчы, ілюстрацыя карціны І. Шышкіна «Карабельны гай», кніга Г. Карцава «Белавежская пушча: 1382—1902, публікацыі газет, часопісаў аб Нацыянальным парку, фотаальбом М. Шарая «Белавежская пушчак Эпіграф:

***У Белавежу увайшла, лібы у храм.***
***Стромкіх дрэваў маўчаць калоны.***
***На кары каля шраму шрам,***
***бы счарнелі старыя іконы.***
***Кроплі смольныя, нібы перлы.***
***Кроны купал неба падперлі.***
***Зубр на мох, бы ягнё, прылёг***
***Ля бярозаў у белай адзежы.***
***Калі недзе існуе Бог,***
***Тут ён, пэўна, у Белавежы.***

Ларыса Геніюш

Гучыць песня «Белавежская пушча» А. Пахмутавай на словы М. Дабранравава (пераклад Н. Арсенневай) у выкананні Датыка (Багдана Андрусішына).

Уступнае слова настаўніка. Бадай, цяжка адшукаць на Беларусі такога чалавека, які б хоць аднойчы не пабываў у сусветна знакамітай Белавежскай Пушчы. А тыя, хто не былі, мараць наведаць самы стары лес Еўропы, што захаваўся ў адносна непарушным стане да цяперашняга часу. Тутэйшыя мясціны сапраўды унікальныя. Візітная картка Беларусі, гонар і слава краіны, найбольшая адметнасць, нацыянальны сімвал — гэтыя і іншыя эпітэты неаднойчы ўзгадваліся ў дачыненні да Белавежкай Пушчы. Усе яны справядлівыя, паколькі адлюстроўваюць тую вялікую значнасць, якую парк мае для нашай дзяржавы, для кожнага беларуса. У многіх выпадках менавіта праз гэтыя запаведныя мясціны іншаземцы ўпершыню даведваюцца пра Беларусь. І гэта знаёмства запамінаецца надоўгаі Таму не дзіўна, што госці імкнуцца зноў завітаць у Беларусь — край прыгожай, некранутай прыроды і цудоўных, адкрытых сэрцам людзей. Не будзе памылкай адзначыць, што Белавежская Пушча аб'ядноўвае мільены людзей ва ўсім свеце.

14 снежня 1992 года ўчастак высока-ўзроставага лесу нацыянальнага парку ўключаны ў спіс Сусветнай спадчыны чалавецтва. На той час гэта быў першы аб'ект на постсавецкай прасторы, так высока ўганараваны.

У 1993 годзе Белавежская Пушча па праве атрымала статус біясфернага запаведніка, а напрыканцы 1997 года Савет Еўропы ўзнагародзіў Белавежкую Пушчу дыпломам як адну з эталоішых прыродаахоўных устаноў на кантыненце. Варта ўзгадаць: усяго два нацыянальныя паркі на планеце маюць усе адпаведныя тытулы — сельва Амазонкі і трапічны лес рэспублікі Габсш. Таму гэта сапраўднас прызнанне той значнай працы, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве ў мэтах захавання прыроднага унікума.

А зусім нядаўна стала вядома, што а нагоды 600-годдзя Нацыянальнага парку 2009 год паводле рашэння ЮНЭСКА аб'яўлены Годам Белавежкай Пушчы — юбілей унікальнага прыроднага комплёксу ўключаны ў спіс памятных дат чалавецтва, так што святкаваць разам з намі будзе ўвесь свет. Гэтаму значнаму юбілею і прысвечаны выпуск нашага вуснага часопіса.

## З гісторыі Белавежскай Пушчы

Гэты старажытны некрануты лсс быў вядомы яшчэ Герадоту, Плінію і Тацыту, якія жылі да нашай эры. Упамінаўся ён і ў Іпацьеўскім летапісе 983 года. Восем стагоддзяў таму ў глухіх навакольных мясцінах гаспадарыла ваяўнічас непакорнае племя яцвягаў Яцвягі былі спрактыкаваныя паляўнічыя, збіралі з борцяў пчаліны мёд. Але яны не выстаялі перад

націскам галіцка-валынскіх, кіеўскіх ды полацкіх князёў, рассеяліся сярод іншых народаў.1Белавежу сталі зваць Зубрынай Краінаю, надзвычай багатаю птушкамі і заярамі. Сюды штогод навсдваліся каранаваныя асобы з гасцямі і незлічонымі світамі. Здаралася, не толькі дзеля паляўнічых уцех і турніраў. Так, зімою 1410 года некалькі месяцаў не сціхала тут рэха паляўнічых рагоў, раздаваліся рыкі і стогны параненай дзічыны. Дружыннікі вялікага князя Вітаўта і караля Ягайлы здабылі тады сотні ласёў, дзікоў, зуброў. Потым іх мясам, засоленым у бочках, падмацоўваліся беларуска-польскія харугвы, якія 15 ліпеня 1410 года ўшчэнт разбілі на Грунвальдскім полі захогшікаў — крыжакоў Тэўтонскага ордэна. Значыць, пушча таксама паспрыяла слаўнай перамозе.

Міналі гады, і ўсё часцей і часцей здараліся вьшадкі, што сведчылі пра бяздумную людскую жорсткасць да прыроды і яе безабаронных дзяцей. Спачатку з пушчанскіх сакавітых лугоў назаусёды зніклі крутарогія асілкі. За імі да апошняй галавы былі выбітыя алені. Крывавая бойня не спынялася, а з удаска-нальваннем зброі, наадварот, набывала ўсс большы і большы размах.

Восенню 1752 года польскі кароль Аўгуст 111 разам з сынам, адпачыааючы ў Белавежы, знішчылі (а як яшчэ інакш назавеш падобнае варварства?!) ажно 42 зубры, 13 ласёў і 2 казулі.

Рускі цар Аляксандр II разам з прыбліжанымі да яго імператарскай персоны за два дні — 6 і 7 кастрычніка 1860 года — умярцвілі (вось дакладнае слова!) у цесных загонах

З паляўнічых вышак 28 зуброў і 68 асобін іншай дзічыны.

Не дзіўна, што ўжо ў XIX стагоддзі Белавежская пушча заставалася без дзікіх коней — тарпанаў, без мядзведзяў і ланяў. Пагроза поўнага вынішчэння навісла і над уладарамі навакольных лясных абшараў. Дарэчы, калісьці ў Еўропе існавалі тры самастойныя разнавіднасці зуброў. На думку вучоных, яны паявіліся 10—12 тысяч гадоў назад: адна раўнінная, ці белавежская, як яшчэ інакш яе называюць, і дзве горныя — каўказская і трансільванска-карпацкая. Зубры часта стапавіліся здабычай старажытных паляўнічых. Пра гэта сведчаць археалагічныя раскопкі першабытных стаянак і паселішчаў, дзе часта трапляюцца разнастайныя прылады працы, зробленыя з зубровых костак. Паступова самая буйная (пасля вынішчанага тура) дзікая капытная жывёліна стала паўсюдна знікаць. У Іспаніі і Балгарыі, напрыклад, гэта адбылося ў X стагоддзі, у Швецыі — у XI, у Англіі — у XII, у Францыі — у XVI стагоддзях. Апошні зубр, які жыў на волі ў Германіі, загінуў у 1793 годзе. Да нядаўна мінулага XX стагоддзя лясныя волаты ацалелі толькі ў Белавежскай пушчы і на горных схілах Паўночнага Каўказа. Аднак нават іх не пашкадавалі двухногія драпежнікі, узброеныя сучаснымі стрэльбамі. Аднаго з іх звалі Барталамей Шпаковіч. Менавіта т у 1919 годзе забіў апошняга пушчанскага зубра. А ў 1927 годзі? такі ж лес напаткаў і яго каўказскага брата, пасля чаго чыстакроўнай горнай разнавіднасці наогул не засталося на зямлі...

Напэўна, зусім звёўся б зубрыны род, але, на шчасце, некалькі дзесяткаў гэтых прыгожых звяроў было ў заапарках Англіі, Германіі, Польшчы і Швецыі. У 1946 годзе, адразу пасля Другой сусветнай вайны, у беларускай частцы лушчы быў створаны зубрагадавальнік, дзе знайшлі надзейны прытулак нершыя 5 зуброў, прывезеных з-за мяжы. Цяпер іх тут, на спрадвечнай радзіме, жыве ла волІ амаль 300 асобін.

**Адкуль пайшла назва Белавежа?**

У XII стагоддзі на тэрыторыі пушчы падоўгу жыў легсндарны Уладзімір Манамах, які паляваў на зуброў, тураў і аленяў. У 1276годзе князь Уладзімір Валынскі даручыў сваіму памочніку Алексу — чалавеку вопытн; му ў будаўнічай справе — адшукаць добр; месца для ўзвядзепня горада. Алекса адр: зу накіраваўся на пошукІ і праз нейкі чззнайшоў такое месца — там, дзе зліваюцііі рэчкі Лясная і Белая, разгарнуліся актыўны работы. Так у гэтьтх мясцінах з'явіўся гора; крэпасць Камянец з вядомай усім вежаі з Белай вежай, пабудаванай тут, многія звязваюць паходжанне назвы Белавежская пушчы. Само ж слова пушча ў беларускай і літоўска мовах асацыіруецца з лесам натуральнага паходжання, які захаваў сваё першастворана аблічча. Што датычыцца слова белавежская то яго этымалогія вывучана недастаткова. На гэты конт існуе некалькі версій. Паводле адной з іх, ракей паселішчы называлі весямі а паселішчы нашых продкаў — весямі белы; людзей альбо белымі весямі. Мабы ідзь, праз некаторы час гэтае словазлучэнне і трансфармавалася ў белыя вежы.

Звязвакшь назву і з літоўскімі словамі бала вешу, што азлачае паселішча каля мокрага лугу балота, якія таксама маглі трансфарміраваццг ў белавежу. Існус яшчэ адна цікавая версія якая звязвае паходжанне назвы пушча : полаўцамі. У X—XIII стагоддзях адбываліся частыя сутыкненні з качавымі народамі, якія прыходзілі з усходу. У X стагоддзі і ў першай палове IX стагоддзя гэта былі печанегі, а з сярэдзіны IX стагоддзя Іх змянілі полаўцы. Вежамі полаўцы называлі сваe станавішчы, куды яны зводзілі Палояяых і звозілі здабычу. Прыметнік жа белы мог ужывацца не толькі для пазвы колеру, але і ў значэнні чысты, вальны, незалежны. Быў ён і сінонімам слова новы. Згодна гэтай версіі назва белавежа з'яўляецца спалучэннем двух слоў, і яго можна разумець як новае пасяленне.

Само ж словазлучэнне Белая вежа ўпершыню з'явілася ў польскіх і літоўскіх граматах 1409 года і з таго часу трывала ўвайшло ва ўжыванне.

**Па слядах паганскіх багоў**

Як вядома, паганства на нашай зямлі захоўвалася даволі доўга. Асабліва ў лясах. Яшчэ і дасюль многае ад яго захавалася — у выглядзе прыкмет, абрадаў, святаў. Як сведчаніie. Існаванне культавых паганскіх комплексаў. Адна з цікавых мясцін — запаведная дуброва ў Белавежскай пушчы. Сярэдні ўзрост дуба тут складае 200 гадоў. Такіх дубоў ва ўсім свеце адшукаецца няшмат. А асобныя дубы — 600-гадовага ўзросту — аднагодкі ўстанаўлення запаведнага рэжыму ў пушчы. Адзін з дубоў увогуле унікальны — бадай што адзіны такі ва ўсім свеце.

Дрэва калісьці было выналена ўнутры, але дасюль жывое. Справа ў тым, што ў першыя два гады прарослы жолуд падсілкоўвае саму расліну. І ў бліжэйшыя 10—15 гадоў дуб расцо не столькі ўверх, колькі ўніз. У гэты час актыўна развіваецца магутная каранёвая сістэма, дрэва атрымлівае як мага больш пажыўных рэчываў. Калі як належыць умацаваліся карані, расце ўверх ствол. Так працягваецца 150—200 гадоў, пасля чаго дуб пачынае расці ўшыркі — таўсцець. Нярэдка здараецца, што праз пэўны час унутраная частка вялізнага дрэва адмірае, у выніку чаго страчвае свае функцыі. Таму і культавы дуб з выпалеішм нутром дасюль захаваўся. У выпалснага дуба спрадвску было асаблівае прызначэнне: кажуць, што калі чалавек праходзіць праз скразное дупло (у ім, як сцвярджаюць, можа адначасова змясціцца да сямі дарослых людзей), то ен быццам зноў нараждаецца. -Кожны пасля такога абраду атрымліваў другое імя: станавіўся іншым чалавекам і змяняў свой лёс.

Ненадалёк ад дуба знаходзіцца і камень-ахвярнік. За многія стагоддзі ён урос у зямлю і пакрыўся мохам. Сваімі абрысамі нечым нагадвае жаночую фігуру. У камені зроблена паглыбленне ў ныглядзе чашы. Напэўна, у гэтым месцы збіралася кроў рытуалыіых жывёл, якіх прыносілі ў ахвяру. А ў верхняй частцы каменя добра бачнае яшчэ адно паглыбленне — доўгая рыса. Пра яго прызначэнне няма дакладнага тлумачэння, і кожны наведвальнік нешта прыдумляе ў сілу сваёй фантазіі.

**Як у зубры скарбы шукал**

У 1795 годзе Белавежская пушча становіцца часткай Расійскай імперыі. Кацярына II дазволіла праводзіць у ёй любыя паляванні (за выключэннем адстрэлу зуброў). Колькасць жывел значна скарацілася, а мядзведзі і бабры былі поўнасцю знішчаны. Кацярына II, а пасля і Павел I, раздалі фаварытам і прыбліжаным участкі пушчы, што нанесла ёй значны ўрон (праводзілася маштабная высечка лесу).

У 1802 годзе Аляксацдр I выдаў указ аб забароне палявайшя на зуброў. Расійскія імператары з вялікай ахвотай наведвалі сваю галоўную паляўнічую рэзідэнцыю. Аб гэтым ёсць цікавыя факты: у 1860 годзе для Аляксандра II ладзілі вялікае паляваннс. У напамін аб гэтай падзеі быў адліты чыгунны зубр у натуральную велічыню, яго ўстанавілі на п'едэстал у Белавежы.

Падчас Першай сусветнай вайны ўся маёмасць царскай сям'і была вывезена. Вывезлі і помнік зубру. Паводле Рыжскага міру, калі вялікая частка тэрыторыі адышла да Полынчы, Расія была вымушана вярнуць каштоўнасці царскага палаца. Вярнулі і помнік зубру, які ўстанавілі ў Спале (дзе ў свой час таксама знаходзілася паляўнічая рэзідэнцыя расійскіх імператараў). Падчас перавозу манумента адбыўся кур'ёзны выпадак: чыіуннаму зверу хтосьці адпілаваў галаву! Магчыма, шукалі скарбы, якія маглі быць схаваны ўнутры. А можа, хто такім чынам хацеў жылле ўпрыгожыць? Як усё было ніхто дакладна не вызначыў. Галаву прыварылі на месца, а ва

ўспамін на зубрынай шыі засталося знарное шво.

Некалькі гадоў таму такога ж зубра (праўда, з пластыку) устанавілі ў Белавежы. А адпу з копій помніка (якая, хутчэй за ўсё, стаяла ў самога цара ў кабінеце) перадалі з Эрмітажа ў Музей прыроды, дзе цяпер гэты вельмі рэдкі экспанат упрыгожвае кампазіцыю.

### Флора і фауна Белавежскай Пушчы

Белавежская Пушча — своеасаблівы ў фларыстычных адносінах рэгіён. Гэта сапраўдная унікальная навуковая лабараторыя для выву-чэння біялагічнай разнастайнасці. Геаграфічнае становішча, кліматычныя і глебава-гідралагічныя асаблівасці абумовілі багаццс флоры. На гэтай адносна невялікай тэрыторыі растуць каля 60 % (каля тысячы відаў) вышэйшых сасудзістых раслін, такая ж доля мохападобных (каля 270 відаў) і лішайнікаў (больш за 290 вілаў).

Белавежская Пушча з'яўляецца унікальным прыродным аб'ектам, дзе прадстаўлена ўся разнастайнасць лясоў Беларусі як па пародным складзе, узроставай структуры і прадукцыйнасці, так і па тыпах. Сярэдні ўзрост лясоў Белавежскай Пушчы складае больў за сто гадоў, максімальны — 200—300 гадоў, а асобныя дрэвы дажываюць да 300 — 600 гадоў. Лясы яе — своеасаблівы фільтр на шляху пераносу тэхнагенных забруджвальнікаў, якія паступаюць разам з наветранымі гаіынямі з краш Заходняй Еўротты, дзе знаходзяцца найбуйнейшыя прамысловыя цэнтры. У Заходняй Еўропе няма вялікіх лясных масіваў, якія выпрацоўвалі б такія аб'ёмы кіслароду (падлічана, што ў пушчы выпрацоўваецца столькі кіслароду, што з лішкам хапіла б на ўсіх беларусаў). Таму пушча мае вялікае значэнне для ўсяго кантынента. Мохавыя і травяныя балоты ў нацыянальным парку займаюць больш за тры тысячы гектараў. Як рэгулятары газавага складу атмасферы і гідралагічнага рэжыму яны адыгрываюць важную ролю ў падтрыманні стабільнасці экасістэм і захаванні біяразнастайнасці не толькі раслін, але і жывёл.

Фауна Белавежскай Пушчы налічвае больш за 10 тысяч відаў. Свет млекакормячых багаты. Ён прадстаўлены 59 відамі, што складае 85 працэнтаў фауны Беларусі. Гэтая колькасць магла б быць і большай, аднак асобныя віды былі знішчаны. Аднавіць відавы склад Белавежскай Пушчы (ці нават яго папоўніць) спрабавалі неаднаразова. Паспяхова бьглі акліматызаваны ці рэакліматызаваны алені, зубры, бабры, а таксама лані (якія былі знішчаны падчас Першай сусветнай вайны).

Асобныя віды знайшлі ў Белавежскай Пушчы экалагічную нішу, мігрыраваўшы з Іншых месцаў. Гэта яно тападобны сабака, андатра і амерыканская норка. Шматлікія тут гры-зуны. Яны прадстаўлены 20 відамі, сярод якіх найбольш адметны — бабер. З драпежнікаў у пушчы знаходзяцца воўк, лісіца, рысь, лясная куніца. Буйныя капытныя — дзік, алень, казуля, лось.

Асобна трэба сказаць пра зубра. Гэта самае буйное і адно з самых старажытных млекакормячых у Еўропе — сучаснік маманта.

Зубры ледзь поўнасцю не зніклі, калі ў 1919 годзе была забіта апошняя зубрыца. У вольных умовах не засталося ніводнай жывелы, пэўная іх колькасць захавалася толькі ў заапарках і заасадах Заходняй Еўропы. Каб выправіць сітуацыю і не дапусціць поўнага вымірання гэтага віду, у 1923 годзе было створана Міжнароднае таварыства па выратаванні зубра. Цяпер сімвалу Белавежы нічога не пагражае — сітуацыя поўнасцю пад кантролем.

### Сённяшні дзень нацыянальнага парку

Белавежская Пушча — найважнейшы аб'ект турызму, сюды штогод прыязджае больш за 1300 тысяч наведвальнікаў з бліжняга і далекага замежжа, таму вельмі важнай задачай з нашага боку з'яўляецца забеспячэнне камфортнага знаходжання турыстаў. Для гэтага ўзведзены шэраг цудоўных гатэляў і ўстаноў харчавання. З мэтай знаёмства гасцей з раслінным і жывёльным светам Белавежскай Пушчы і іншымі яе знакамітасцямі распрацаваны шэраг турыстычных маршрутаў: пешых, конных, аўтамабільыіых, адна- і шматдзённых.

У 2003 годзе на тэрыторыі запаведніка створана сядзіба беларускага Дзеда Мароза. Гэта паспрыяла значнаму росту колькасці наведвалыііkаў нацыянальнага парку. Рэзідэнцыя ўключае непасрэдна сядзібу Дзеда Мароза, вятрак, чароўны калодзеж, скульптурныя кампазіцыі з дрэва «12 месяцаў», «Беласнежка і 7 гномаў», а таксама аб'екты гандлёвага і забаўляльнага прызначэння. Тут знаходзіцца самая высокая ў Еўропе саракаметровая ёлка. Рэзідэнцыя працуе

круглыя суткі.

Сапраўдны гонар — музей Прыроды. Тут сабрана найбагацсйшая калекцыя жывёл, якія насяляюць пушчу. Частка іх занесена не толькі ў беларускую, але і ў міжнародную Чырвоную кнігу.

За захаванне эталонных прыродных комплексаў, напулярызацыю ідэй аховы прыроды, стварэнне ўмоў для развіцця турызму нацыянальны парк Белавежская Пушча на Міжнародным форуме лідэраў у 2006 і ў 2007 гадах атрымаў залаты медаль у намінадыі «Спадчына», а ў красавіку 2008 гада на IX вясновым кірмашы турыстычных паслуг «Адпачынак-2008» у Мінску ўзнагароджаны дыпломам у намінацыі «Лепшы турыстычны аб'ект Беларусь.

Зараз нацыянальны парк Белавежская Пушча разам з некаторымі іншымі прырода-ахоўнымі ўстановамі рэспублікі падпарадкаваны кіраўніцтву справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта сведчыць аб клопаце дзяржавы пра захаванне унікальных прыродных помнікаў, спрыяе павелічэнню іх прэстыжу ў вачах жыхароў рэспублікі і замежных гасцей.

**Заключнае слова настаўніка.**

Ляцяць стагоддзі, а пушча паранейшаму радуе шумам векавечных дуброў. Яна ўражвае, зачароўвае і натхняе ў любую пару года. І не дзіўна, што калісьці пад шатамі яе дрэў вясну і лета правёў вялікі рускі пейзажыст Іван Шышкін і зрабіў некалькі эцюдаў. Ствараў у пушчы свае вядомыя літаграфіі Антон Каменскі, ужо ў нашы дні Мацвей Бялыніцкі падараваў свету цудоўную серыю сваІх жывапісных карцін.

Многія беларускія паэты розных эпох натхняліся непаўторнай прыгажосцю і веліччу пушчы. Яшчэ М. Гусоўскі зрабіў зубра і пушчу эмблематычнамі сімваламі беларускага краю, своеасаблівай візітоўкай для знаёмства з яго прыродай, а таксама характарам, жыццём народа. Для Гусоўскага пушча — прытулак і эліксір душы. Вядомы еўрапейскі паэт Ф. Пятрарка казаў, што лясы — сябры, шчырыя аднадумцы. Таму зразумела, чаму ў эпоху Адраджэння загучалі матывы ў абарону прыроды як скарбу душы, быў высока ўзняты культ раяумяых, гарманічных адносін паміж чалавекам і прыродай.

Словы захаішення гэтым дзівосньш кутком прыроды знаходзім у творах У Дубоўкі, М. Танка, А. Вялюгіна, А. Лойкі, Р. Барадуліна. Самым жа «пушчанскім» паэтам з'яўляецца Казімір Камейша. Пра сябе ён сказаў так: «Я з пушчы прыйшоў, пушчанец. Ад сосен сваіх, ад бяроз». Мастак слова пранікнёна паэтызуе сівую Пушчу, суадносіда з ёй сваё жыццё, думкі і перажыванні, бо яна — «зялёная Біблія».

Вядомыя паэт і кампазітар Мікалай Дабранраваў і Аляксандра Пахмутава пасля наведвання запаведпіка напісалі ў кнізе ганаровых гасцей: «Упершыню пабачылі сапраўдны цуд прыроды. Перажылі непаўторнае пачуццё захаплення і радасці...» Тыя пачуцці потым вылiліся ў цудоуную музыку І не менш цудоўныя словы ўсім вядоыай песні пра Белавежу ў выкананні «Песняроў». Пушча жыве кіпучым, стваральным, паўнакроўным жыццём. І ў той жа час кожнага, хто б сюды ні паведаўся, сустракае запаведнай цішынёй, чысцінёй сваіх вод і паветра.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Сабіна Летро. Беларусь жнвоішсная. — Мннск : Беларусь, 2006.

2. Хаткетіч, 0. А. Прнрода н мы / О. А. Хатксвнч, О. А. Мнннч. - Мннск : НООО «Краснко-Прннт», 2004.

3. Экологаческое образонанне для устойчмвого развнтня: отечественный н межлународный опыт : матсрмалы междунар. конф, — Мннск, 2003,

4. Ягоўдзш, У. Выбранае / У. Ягоўл.чік. — Мінск : ізыдавец М. Р. Ягоўдзік, 2005.

Т. У. Луста, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Багушэвіцкага НПК дзіцячы сад — сярэдняя школа

***Т.Луста***

**Источник:** Пазашк.выхаванне.-2009.-№8.-С.20-26.